View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Работа ў групах як эфектыўная форма развіцця крытычнага мыслення падлеткаў

*Ігнатовіч В.Г., Сідаровіч В.А.*

*У артыкуле аўтарамі разглядаецца актуальнасць праблемы фарміравання крытычнага мысленя асобы на сучасным этапе развіцця грамадства, паняцце “крытычнае мысленне”, а таксама працэс развіцця крытычнага мыслення падлеткаў. Эфектыўнай формай для рашэння дадзенай праблемы аўтары лічаць работу ў групах як аптымальную форму арганізацыі навучання. Выдзелены фактары, якія ўплываюць на паспяховасць фарміравання групы, выяўлены ўменні, неабходныя для групавой арганізацыі дзейнасці і якасці, характэрныя для асобы, якая мысліць крытычна. Аўтарамі разглядаецца ўзаемасувязь якасцей асобы, уменняў мысліць крытычна і ўменняў, неабходных для работы ў групе.Аналізуюцца састаўныя часткі паняцця “група” з пазіцыі крытычнага мыслення. Аўтарамі апісаны асноўныя псіхолага-педагагічныя і метадычныя ўмовы паспяховага выкарыстання групавой работы, дадзены метадычныя рэкамендацыі.*

Сёння ў грамадстве запатрабавана асоба, якая здольна не толькі ўспрымаць інфармацыю і эфектыўна засвойваць, але і перапрацоўваць яе і ствараць новую. Для эффектыўнасці працякання гэтых працэсаў асоба павінна валодаць крытычным мысленнем. Менавіта крытычнае мысленне становіцца адным з самых неабходных і перспектыўных відаў мысленчай дзейнасці людзей ва ўмовах дынамічных эканамічных, сацыяльных і культурных трансфармацый ў грамадстве. У сувязі з гэтым задача развіцця крытычнага мыслення з’яўляецца адной з прыярытэтных на ўсіх ступенях адукацыі. Разам з тым даследаванне рэальнай адукацыйнай сітуацыі ўпэўнівае ў тым, што развіццё крытычнага мыслення не з’яўляецца мэтай вучэбна-выхаваўчага працэсу, а аналіз сучаснай айчыннай і замежнай педагагічнай і псіхалагічнай літаратуры сведчыць аб тым, што крытычнае мысленне як педагагічны феномен даследаваны недастаткова.

У псіхолага-педагагічнай літаратуры разгледжаны асобныя аспекты фарміравання крытычнага мыслення: удасканаленне арганізацыі і метадаў вучэбнага працэсу (А.Д. Абакумаў, І.Г. Агапаў), узаемасувязь крытычнага мыслення і талерантнасці (В.А Папкоў, Е.Л. Разанава), крытычнае мысленне школьнікаў (Ф.Ф. Мінкіна, Е.А. Мухіна), крытычны стыль мыслення (М.А. Тарасава), лагічнае мысленне (В.С. Ягорына), мэтанакіраванае развіццё інтэлектуальных уменняў (М.А. Халодная). Метадычны аспект праблемы фарміравання крытычнага мыслення раскрылі А.В. Бутэнка, І.В. Муштавінская, А.І. Ліпкіна, Л.А. Рыбак, Н.Г. Суворава. С.І. Векслер). Асаблівасці фарміравання крытычнага мыслення ў малодшых школьнікаў

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

выявілі А.С. Байрамаў, Т.Ю. Капылава, В.М. Сінелькоў, спецыфіка развіцця крытычнага мыслення студэнтаў апісана А.В. Бутэнка, А.Ф. Керымавым.

Асветлены пытанні фарміравання рэфлексіўнага мыслення (Дж. Дзьюі), псіхалагічныя і лагічныя аспекты рэфлексіі і творчасці (Н.Г. Аляксееў, Г.Г. Гарантаў, В.Г. Рындак, П.М. Якабсан).

Праблема развіцця мыслення ў адукацыйным працэсе звязваецца з пытаннямі актывізацыі пазнавальнай дзейнасці (Е.С. Заір-Бек, І.А. Зімняя, А.Н. Ксенафонтава, Г.І. Шчукіна), арыентацыямі на творчае мысленне (Л.А. Грыгаровіч, Г. Ліндсэй, Р.Ф. Томпсан, П.Ф. Філіпаў, К.С. Халл), фарміраваннем альтэрнатыўнага мыслення (В. І. Загвязінскі, В. В. Краеўскі), фарміраваннем даследчай культуры асобы (Т.Е. Клімава, В.А. Сласценін).

Мысленне непасрэдна звязана з пазнавальнай дзейнасцю. Этымалагічны аналіз катэгорыі “крытычнае мысленне” звяртае нас і да паняцця “крытыка”. І. Кант лічыў, што “крытыка – гэта адна з важнейшых здольнасцей чалавека, якая засцерагае яго ад памылак ” [2, с. 54].

У “Слоўніку замежных слоў і выразаў” знаходзім наступнае азначэнне: “Крытыка – мастацтва разбіраць, судзіць, спосаб духоўнай дзейнасці, асноўная задача якога заключаецца ў тым, каб даць цэласную ацэнку” [6, с. 67].

Зыходзячы з дадзеных азначэнняў, мы заключаем, што “крытыка” – гэта даследаванне, абмеркаванне, разгляд, праверка правільнасці чаго-небудзь; ацэнка; выяўленне недахопаў і прызнанне пэўных вартасцей.

Тэрмін “крытычны” з’яўляецца вытворным ад слова “крытыка”. Такім чынам можна заключыць, што крытычным мысленнем валодае асоба, якая здольна крытычна адносіцца да каго-небудзь або чаго-небудзь.

У ходзе любога ўрока настаўнік забяспечвае актыўную пазнавальную дзейнасць вучняў, выкарыстоўваючы разнастайныя формы яе арганізацыі: франтальную, групавую і індывідуальную. Настаўнікі, якія імкнуцца развіваць у вучняў крытычнае мысленне, заўсёды выкарыстоўваюць на сваіх занятках розныя віды парнай і групавой работы. Некалькі гадоў назад у сістэму адукацыі многіх краін свету былі ўведзены ключавыя кампетэнцыі, якія патрабуюцца ад выпускнікоў школ і універсітэтаў. Да іх адносяцца: уменне прымаць рашэнні і несці адказнасць за яго, уменне працаваць у групах, адкрытасць новым ведам – здольнасць зразумець чаго не хапае і як гэты прабел ліквідаваць, уменне і жаданне жыць у інфармацыйным грамадстве. Дона Огл, адна з добраахвотніц праекта РКМЧП, пісала: “Адной з мэтаў нашай адукацыйнай сістэмы з’яўляецца выхаванне грамадзян, якія мысляць крытычна, якія здольны рашаць не толькі мясцовыя, але і агульнанацыянальныя і нават міжнародныя праблемы” [4].

Д. Клустэр заўважае: “Любы крытычны мысліцель працуе ў нейкім аб’яднанні і рашае больш значныя задачы, а не толькі канструяванне уласнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асобы. Настаўнікі, якія развіваюць крытычнае мысленне ў сваіх вучняў, надаюць вялікую ўвагу выпрацоўцы якасцей, неабходных для прадуктыўнага абмену меркаваннямі: цярпімасці, уменню пачуць другіх, адказнасці за ўласны пункт погляду. Такім чынам педагогам удаецца наблізіць вучэбны працэс да рэальнага жыцця, якое працякае за сценамі класнага памяшкання. Любая педагагічная дзейнасць у ідэале накіравана  на пабудову больш дасканалага грамадства, у гэтым сэнсе нават адзін школьны клас, які валодае асновамі крытычнага мыслення, ёсць крок да дасягнення вялікіх мэтаў” [5, с. 83].

Значыць, паколькі “крытычнае мысленне ёсць мысленне сацыяльнае”, то найбольш эфектыўнай формай пры фарміраванні і развіцці ўменняў мысліць крытычна з’ яўляецца групавая, у працэсе якой адбываецца ўзаемадзеянне настаўніка з вучнямі і вучняў паміж сабой. Пад групавой работай ў педагагічнай навуцы і практыцы разумеецца від калектыўнай дзейнасці вучняў, пры якой клас дзеліцца для выканання вызначаных вучэбна-пазнавальных задач на групы, здольныя самастойна ставіць мэты і дасягаць іх [3, с.14]. Групавую работу характарызуе непасрэднае ўзаемадзеянне паміж вучнямі.

Групавая работа з’яўляецца аптымальнай формай арганізацыі навучання, у рамках якой  ажыццяўляецца працэс развіцця крытычнага мыслення падлеткаў. Дадзена форма работа ў большай ступені адпавядае дамінуючым патрэбам падлеткавага узросту – патрэбе ў зносінах з аднагодкамі і патрэбе ў самавыражэнні. Кожны падлетак у працэсе групавой работы можа выказаць уласнае меркаванне, якое будзе ацэнена равеснікамі.

Удзел падлеткаў у групавой рабоце садзейнічае:

- доўгачасоваму запамінанню;
- свабоднаму і асэнсаванаму мысленню;
- больш мэтанакіраваным і менш дэструктыўным паводзінам;
- імкненню да большага поспеху і ўнутранай матывацыі да вучобы;
- развіццю здольнасці да ацэнкі сітуацыі з пазіцый другога чалавека;
- станоўчым, добразычлівым і сяброўскім адносінам з равеснікамі, якія не залежаць ад этнічных, палавых, інтэлектуальных, сацыяльных і фізічных адрозненняў  у групах;
- большай сацыяльнай падтрымцы;
- фарміраванню моцнага псіхалагічнага здароўя,;
- развіццю самапавагі, заснаванай на станоўчай самаацэнцы;
- лепшай сацыяльнай кампетэнцыі;
- фарміраванню станоўчых адносін да вучобы, школы, вучэбнага прадмета, да настаўнікаў, бацькоў і іншых работнікаў школы;

Работа ў групах уяўляе сабой эфектыўную тэхніку для актыўнага ўключэння ўсіх вучняў ва ўрок, для папярэджання варожасці, змянення

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спосабаў мыслення вучняў, для выхавання сацыяльных і маральных навыкаў: талерантнасці, прыняцця розных меркаванняў, пунктаў погляду, здольнасці працаваць у камандзе, прымаць групавыя рашэнні.

Не ўсякая група людзей, якія маюць агульную мэту і працуюць сумесна, гарантуе эфектыўны працэс дасягнення мэты і атрымання станоўчага выніку. На дзейнасць групы аказваюць уплыў многія фактары і, у першую чаргу, узровень валодання членаў групы эфектыўнымі сумеснымі дзеяннямі. Далей у табліцы 2 прадстаўлена ўзаемасувязь фактараў, якія ўплываюць на поспех групы і эфектыўнасці дзеянняў членаў групы [7].

*Табліца 1. − Фактары, якія ўплываюць на паспяховасць фарміравання групы*

| **Фактары, якія ўплываюць на паспяховасць групы** | **Эфектыўныя дзеянні членаў каманды групы** |
|---|---|
| Яснасць мэтаў і задач групы | 1. Узгадняць свае задачы і не дапускаць рознагалоссяў.<br>2. Бачыць, наколькі пастаўленыя задача ажыццяўляльная, і змяніць яе ў выпадку неабходнасці.<br>3. Рэальна ацэньваць сітуацыю і ісці да пастаўленай мэты. |
| Наяўнасць плану дзейнасці і развіцця | 1. Складаць план работы групы.<br>2. Карэкціраваць яго ў працэсе работы. |
| Размеркаванне роляў | 1. Усе члены групы павінны дакладна ўсведамляць свае ролі, за што адказвае кожны з іх і на што яны накіраваны.<br>2. Выкарыстоўваць таленты кожнага члена каманды. |
| Высокая культура зносін | 1. Гаварыць ясна і дакладна.<br>2. Умець слухаць другіх. Пазбягаць размоў у час выступлення другога члена групы.<br>3. Абдумваць атрыманую інфармацыю. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| Выбар эфектыўных паводзін каманды | 1. Праводзіць дыскусіі.<br>2. Абмяркоўваць інфармацыю і меркаванні ўсіх членаў групы.<br>3. Прапаноўваць рацыянальныя дзеянні і спосабы дасягнення мэт.<br>4. Уносіць яснасць і прадумваць пытанні для абмеркавання.<br>5. Не адыходзіць ад тэмы гутаркі.<br>6. Пры рознагалоссях быць творчым . Умець ісці на кампраміс.<br>7. Дзяліцца атрыманымі ўражаннямі.<br>8. Дабівацца згоды. |

Аналіз фактараў дазваляе выявіць уменні, неабходныя для групавой арганізацыі дзейнасці:

- мысліць самастойна і рабіць незалежныя ацэнкі;
- аргументаваць сваё меркаванне, даказваць і абвяргаць пункт погляду;
- выяўляць праблемы, шукаць альтэрнатыўныя шляхі выхаду з сітуацыі;
- уносіць ідэі і ставіць мэты;
- псіхалагічна правільна ўступаць у працэс зносін і валодаць эмоцыямі;
- адкрыта і канструктыўна крытыкаваць;
- ацэньваць свой і чужы пункт погляду і змяняць яго пад уплывам аргументаў;
- валодаць культурай дыскусіі, мовы і даступна выказваць сваё меркаванне;
- слухаць і чуць свайго суразмоўцу.

Група не зможа паспяхова працаваць, калі вучні не будуць валодаць неабходнымі сацыяльнымі навыкамі і карыстацца імі.

У працэсе групавога ўзаемадзеяння актуалізуюцца якасці, характэрныя для асобы, якая мысліць крытычна, - дапытлівасць, успрымальнасць, упэўненасць у сабе, самастойнасць, камунікабельнасць, свабода выказвання думкі, смеласць у выказванні ідэй. Уменні, якія неабходны для работы ў групе, судносяцца з якасцямі і ўменнямі, што характарызуюць крытычнае мысленне (табліца 2).

*Табліца 2 - Узаемасувязь якасцей асобы, уменняў мысліць крытычна і ўменняў неабходных для работы ў групе.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Якасці асобы, якая мысліць крытычна | Уменні, неабходныя для крытычнага мыслення | Уменні, неабходныя для работы ў групе |
|---|---|---|
| Пытлівасць, успрымальнасць | Уменне асэнсоўваць свае дзеянні і усведамляць схемы і правілы, па якім ён дзейнічае. | Выяўляць праблемы, шукаць альтэрнатыўныя шляхі выхаду з сітуацыі; |
| Упэўненасць, самастойнасць, камунікатыўнасць | Уменне самастойна адстойваць свае перакананні і знаходзіць адказы на «возражения»; аналізаваць інфармацыю, меркаванні для ацэнкі і праверкі даставернасці; уменне выкарыстоўваць прынцыпы і правілы логікі (аргументацыю, доказ) | Мысліць самастойна; даказваць, аргументаваць; выносіць ідэі і ставіць мэты; адкрыты і канструктыўна крытыкаваць; ацэньваць і змяняць пункт погляду. |
| Раскаванасць, смеласць у выказванні ацэнак | Уменне аналізаваць свае перакананні, аргументы для крытычнай ацэнкі і карэкцыі (перад аўдыторыяй); самаацэнка і самакарэкцыя; уменне актуалізаваць уласныя і чужыя якасці асобы:пытлівасць, назіральнасць, цярпімасць, смеласць, раскаванасць, тактоўнасць і г. д. | Адкрыты і канструктыўна крытыкаваць; валодаць ультурай дыскусіі, мовы. |
| Цярпімасць, адказнасць | Уменне арганізаваць кантроль і самакантроль; уменне супастаўляць канечныя рэзультаты і мэты, задачы, план дзейнасці; уменне аналізаваць прычыны неадпаведнасці і ўласныя памылкі; уменне прынімаць рашэнні па ліквідацыі неадпаведнасцей ў рабоце | Уменне аргументаваць і даказваць, выносіць ідэі; валодаць эмоцыямі; уменне слухаць і чуць другіх. |
| Тактоўнасць | Уменне параўноўваць, супастаўляць, абагульняць, канкрэтызаваць чужое і | Валодаць эмоцыямі; умець слухаць і чуць другіх. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | |
|---|---|---|
| | ўласнае меркаванне | |

Структура групы з пазіцыі крытычнага мыслення ўключае пяць блокаў (малюнак 1). У першы блок, сістэмна-мысленчы, уваходзяць такія ўменні, як самастойнасць ацэнкі даступнась і культура выкладання. Для іх фарміравання неабходна валодаць такімі якасцямі, як камунікабельнасць і ўпэўненасць у сваіх сілах.Члены группы фарміруюць свае ацэнкі незалежна ад астатніх, бо толькі індывідуальны, самастойны характар робіць мыслаенне крытычным. У другі блок, кагнітыўна-рэфлексіўны, уваходзяць уменне аргументаваць пункт погляду, выносіць ідэі і ставіць мэты, валодаць эмоцыямі. Для іх фарміравання неабходна валодаць такімі якасцямі, як адказнасць і цярмімасць, упэўненасць у сваіх сілах. Крытычнае мысленне ўзнікае тады, калі перад членамі групы ставяцца праблемы, з якіх пачынаецца самастойны мысленчы працэс. Валоданне эмоцыямі прадугледжвае ўмене выслухаць субяседніка, правільна весці гутарку, валодаць культурай дыскусіі [7].




**Малюнак 1 – Структура групы з пазіцыі крытычнага мыслення**

У трэці блок, творчы, уключаны ўменні выяўляць праблемы, шукаць альтэрнатыўныя шляхі выхаду з сітуацыі, адкрыта выказваць сваё меркаванне.Уменне слухаць складае чацвёрты блок, а ўменне ацэньваць і

прымаць аргументы – пяты блок. Яны аб’яднана такой якасцю як камунікабельнасць.

Эфектыўнасць развіцця крытычнага мыслення падлеткаў ў працэсе групавой работы залежыць ад яе арганізацыі настаўнікам. Адносіны, якія складваюцца паміж настаўнікам і вучнямі, “вызваляюць педагога ад ролі усязнайкі, але прымушаюць прыняць не меней цяжкую ролю арганізатара працэсу пазнання” [1]. Паспяховае выкарыстанне групавой работы гарантуецца наступнымі асноўнымі ўмовамі – клас павінен:

- быць месцам разважанняў настаўнікаў і вучняў;
- быць загадзя прадуманым і адпаведным чынам абсталяваным месцам, у якім вучні ўцягваюцца ў сур’ёзныя даследаванні;
- быць месцам, дзе настаўнік дакладна фармулюе свае патрабаванні да вучняў і адкрыта абмяркоўвае іх з вучнямі;
- стымуляваць інтэлектуальную дзейнасць;
- гарантаваць належныя ўмовы для параджэння наватарскіх ідэй і выказвання самых розных меркаванняў.

Такім чынам, работа ў групах стымулюе мысленчыя працэсы, правацыруе сур’ёзныя дыскусіі і ідэі, садзейнічае рэгулярнаму абмену філасофскімі поглядамі і перакананнямі. Работа ў групах выступае адной з умоў, выкананне якой дазваляе рэалізаваць адну з важнейшых мэтаў навучання, якая заключаецца ў максімальным клопаце пра інтэлектуальнае развіццё вучняў, а значыць, пра іх здольнасць мысліць крытычна, рашаць праблемы, прымаць наватарскія рашэнні.

## Спіс выкарыстаных крыніц:


1 Возовикова, Н.Р. Развитие творческих способностей учащихся/ Н.Р. Возовикова // Народная асвета. - № 6 . – 2004. – С. 84 - 87.

2 Кант, И. Трактаты и письма / И. Кант // Памятники философской мысли. – М.: Наука, 1980. – 709с.

3 Кимеева, О.А. Развитие познавательной активности старшеклассников в процессе групповой работы: автореф…. дис. канд. пед. наук: 13.00.01 / О.А. Кимеева. - Киров, 2000. – 20с.

4 Кларин, М.В. Инноваци в мировой педагогике / М.В. Кларин. − Москва-Рига: Издательство “Эксперимент”, 1998. – 180с.

5 Клустер, Д. Что такое критическое мышление? / Д. Клустер // Народная асвета. − № 3 . – 2004. – С. 81 - 83.

6 Словарь иностранных слов и выражений. – М.: Русский язык, 1980.- 624с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7 Шакирова, Д.М. Интеграция умений критически мыслить и работать в команде при обучении студентов ВУЗА / Д.М. Шакирова, Н.Ф. Плотникова // Инновации в образовании. – 2006. - № 3. – С. 120 - 133.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аб аўтарах:

**Ігнатовіч Вія Генадзьеўна**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры педагогікі і псіхалагіі пачатковага навучання Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка, скончыла факультэт беларускай філалогіі і культуры вышэйназванага універсітэта, у перыяд навучаня ў аспірантуры Нацыянальнага інсытута адукацыі Міністэрства адукацыі РБ узнагароджана стыпендыяй Прэзідэнта РБ, аўтар больш за 90 прац.
*Адрас: 220021, г. Мінск, пр-т Партызанскі, д.88, кв.36.*
*E-mail:* mladda@mail.ru
*Тэлефоны:* сл. 8017-267-78-64, маб. 8029-276-49-06 (МТС).
*Пашпарт:* МР 2156014, Заводскае РУУС г. Мінска, 17.07.2006.
*Ідэнтыфікацыйны №* 4061072А001РВ7
*Адрас:* 220021, г. Мінск, пр-т Партызанскі, д.88, кв.36.

**Сідаровіч Вольга Анатольеўна**, магістр педагагічных навук.
*Адрас: 225320, г. Барановічы, вул. Касманаўтаў, д.7 кв.28.*
*E-mail* --
*Тэлефоны:* х. 80163-47-54-56, маб. 8025-28-19-10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ